# Свята “ТРАЕЦКАЕ ГУЛЯННЕ”

**Сцэнарый сюжэтна – гульнёвай праграмы**


Аўтар:

*Чалавенка Наталля Мікалаеўна,*

*культарганізатар*

*дзяржаўнай ўстановы адукацыі*
*“Цэнтр дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі*
*“Кантакт” г.Мінска”*


**Мэта**:

– выхаванне патрыятызма, пачуцця годнасці, любові да блізкага, да радзімы, яе прыроды, мовы, культуры.

**Задачы:**

– пазнаёміць вучняў з разнастайнымі жанрамі беларускага фальклору, святамі і абрадамі, традыцыямі беларускага народа на аснове свята “Троіца”;
– выхоўваць цікавасць у дзяцей і падлеткаў да пазнання і захавання багаццяў нацыянальнай культуры;
– стварыць ўмовы для развіцця культуры маладога чалавека, яго пазнавальнай і пошуковай дзейнасці, інтэлектуальнага і духоўнага патэнцыялу;
– уключыць выхаванцаў у творчую дзейнасць, звязаную з выкарыстаннем вуснай народнай творчасці, традыцый, звычаяў;
– актывізаваць патрэбнасць вучняў у захаванні і перадачы іншым пакаленням нацыянальных, духоўных і культурных каштоўнасцей.

## Метадычныя парады

Гульня-падарожжа “Траецкае гулянне” праходзіць улетку з дзецьмі летняга аздраўленчага лагера ў Старажоўскім скверы. Прызначана адразу да некалькіх атрадаў. На асноўнай пляцоўцы дзеючыя асабы ў вобразах пацешнікаў, ці казачных персанажаў запрашаюць ўсіх пастроіцца па атрадах. Вядучая праводзіць пераклічку атрадаў, знаёміць дзяцей са святам “Троіца” і распавядае аб тым, якім чынам будзе праходзіць гулянне.

Кожнаму атраду даецца свая “таямнічая паштоўка” рознага колеру: нарыклад: “Зялены”, “Чырвоны”, Жоўты”, “Блакітны”, “Фіялетавы” – гэта своеасаблівы “Маршрутны ліст” *(Прылажэнне, мал. 1)*, у якім напісаны “станцыі-палянкі”, якія павінны знайсці ўдзельнікі праграмы і выканаць на іх патрэбныя заданні. На кожнай “станцыі – палянцы” дзяцей сустракаюць пацешнікі, ці казачныя персанажы (настаўнікі Цэнтра), якія даюць ім розныя заданні, праводзяць гульні, а на прыканцы, ставяць адзнаку. Пасля таго, як

атрады пройдуць “станцыі-палянкі” ўсе збіраюцца зноў на асноўнай пляцоўцы і паказваюць сваё хатняе заданне, пасля чаго вядучы аб’яўляе вынікі гуляння, і ўсёй нядзелі, каманды атрымліваюць прызы і падарункі.

***РЕКВІЗІТ І КАСЦЮМЫ:***

- ***ручнікі – 2 шт.;***
- ***вяроўкі – 2 шт. – 1- 30 м., 1 – 20 м. (для абазначэння пляцовак);***
- ***гульневыя конусы 2 шт.***
- ***паштоўкі – 4-шт. (рознага колеру);***
- ***кошыкі – 2 шт.;***
- ***зяляніна – розныя кветкі, галінкі дрэў;***
- ***касцюмы казачных персанажаў, ці міфічных вобразаў – 5 шт. («Русалка», «Музыка», «Цётка», і інш.);***
- ***граматы і прызы для ўзнагароджвання.***

***МУЗЫЧНАЕ АФАРМЛЕННЕ:***

****баян – 1.***

****шумавыя народныя прылады.***

## ХОД ПРАГРАММЫ

*Усе збіраюцца на галоўную пляцоўку і скверы.*

**Вядучая:”Цётка” –**Добры дзень, паважаныя сябры! Мы рады вітаць усіх вас на нашым свяце! А ці ведаюць нашы госцейкі што – нібудзь пра свята Троіца?
(*дзеці адказваюць*). Я абавязкова вам раскажу пра свята, але спачатку давайце зробім пераклічку. (*знаёмства з атрадамі*).



Ну, а зараз, слухайце.

Троіца – адно з самых любімых святаў на Беларусі – летняе, прыгожае. Гэта славянскае дахрыцсціянскае свята называлі раней “Сеймік”, або “Семік”. Яно раней было першым веснавым святам: першы збор на ігрышчы, выхад у поле і ў лес, замольванне і завіванне дрэў, пляценне вянкоў, адгадванне лёсу, ”кумаванне” з улюбленымі кумамі, першы веснавы торг або кірмаш, першае абмеркаванне земляробчых, гаспадарчых спраў. Усе гэтыя асаблівасці Сейміка ў пазнейшую эпоху пераразмеркаваліся і перайшлі да новых свят: Вялікдзеня, Юр’я, Міколы, Тройцы і інш. Да Тройцы ад Семіка перайшло ўпрыгожванне дамоў, дарог, вуліц, рагатай жывелы ўсякай зялянню, таму і само свята атрымала назву: “Зяленыя святкі”.
Яшчэ  гэта свята было ў гонар вясны як апекуна шлюбаў, Вясны – нявесты, ўпрыгожанай кветкамі і зялянню, якая ішла насустрач свайму жаніху – Семіку. Таму і свята лічылася лепшым ў годзе часам для кахання і для варажбы аб будучым сямейным шчасці. А сам Семік, па паданнях, паказваўся вяселым, ласкавым юнаком, а святкаванні, прысвечаныя яму, пачыналіся з таго, што дзяўчаты і жанчыны выходзілі на луг з зялёнымі галінкамі ў руках, танцавалі каля пастаўленай ў полі статуі Вясны ці Семіка, упрыгожанай зялянню і кветкамі, і пелі песні ў гонар кахання, якія прыносілі ім асалоду. Вось зараз калі ласка, вы яе паслухайце, а хто ведае заспявайце разам з намі.

*На пляцоўцы з’яўляюцца дзяўчынкі з фальклорнага гурта “Сунічка”, з вяночкамі на галаве і спяваюць:*

- Пойдзем, дзевачкі, у луг гуляць,

Зяленыя вянкі завіваць.
Заўем вянкі на ўсе святкі,
На ўсе святкі, на ўсе праздначкі…

**Вядучая “Цётка”**: Гэты звычай захаваўся ў Пінскім павеце. На другі дзень Тройцы дзяўчаты выбіралі самую прыгожую і  маладую дзяўчынку і надзявалі на яе ўбранне. Сплеценае з маладых бярозавых і кляновых галінак з лісцем. Прыбраная такім чынам, атрымлівала назву “Куст” . Дзяўчаты станавяцца парамі, спачатку старэйшыя, потым малодшыя, а нарэшце – дзеці, водзяць вакол яе карагоды, і ідуць да знаёмых, абыходзяць дамы з песнямі, збіраюці пачастункі, узнагароды.  Вось мы з вамі зараз і адправімся ў наша незвычайнае падарожжа і будзем збіраць не ўзнагароды, а зарабляць сваім розумам, спрытнасцю, уменнем працаваць разам  балы, а потым збярэмся зноў на нашай галоўнай пляцоўцы, дзе пакажам сваё хатняе заданне, а вось потым атрымаем і ўнагароды. Зараз да мяне падыйдуць капітаны кожнага атрада і атрымаюць “таямнічую паштоўку”, у якой зноўдуць “Маршрутны ліст” у якім абазначаны “станцыі - палянкі”, якія вы ўсе павінны прайсці і выканаць ўсе заданні. Дарэчы, вы павінны рухацца строга па парадку. Станцыі-палянкі знаходзяцца ў розных мясцінах нашага сквера і вы самі павінны іх знайсці, а там вас будуць чакаць незвычайныя жыхары нашага гуляння. Я жадаю ўсім поспехаў і ў добры час. Сустрэнемся пасля праходжвання “станцый” праз 50 хвілін на галоўнай пляцоўцы.

*Атрады адпраўляюцца на "станцыі-палянкі", дзе іх сустракаюць настаўнікі Цэнтра ў розных вобразах і выконваюць ўсе іх заданні і выпрабаванні.*

<u>**"Станцыі-палянкі"**</u>

<u>**"Запляці вяночак"**</u>

*Сустракае на станцыі сама вядучая "Цётка" (у народным касцюме).*

**Вядучая "Цётка":** - Пойдзем, дзевачкі, ў луг гуляць,
Зялёныя вянкі завіваць.
Заўем вянкі на ўсе святкі,
На ўсе святкі, на ўсе праздічкі.



У гэты ж дзень, паважаныя сябры, дзяўчынкі плялі вяночкі, потым ішлі да вады, якая прабуджалася з прыходам вясны, і там праводзілі варожбы: пускалі па вадзе свае вянкі і назіралі за іх рухам.
Як вы лічыце, калі вянок паплыве, што гэта адзначала? (добрая прыкмета)
А калі патоне?... (дрэнная)
*(дзеці адказваюць на пытанне)*

**ВЯДУЧАЯ "Цётка": -** А зараз давайце паспрабуем сплесці вяночкі. Калі закончым пляценне, дзяўчаты будзуць накідваць вяночак на галаву хлапчукоў, чаму, а я вам растлумачу: пасля Тройцы, ці пад час яе адбываліся цікавыя абрады з русалкамі. Адзін з іх, гэта калі дзяўчаты – русалкі кідалі свае русальныя вянкі ў хлапцоў, што скакалі праз вогнішча, калі вянок пападаў ў хлапца, гэта адзначала, што дзяўчына выбрала, менавіта яго.



*Праводзіцца гульня”Вяночак”. У двух кошыках знаходзіцца розная зяляніна і кветкі.Пакуль вядучыя растлумачваюць гульню, памочнікі раздаюць зяляніну ўсім у атрадзе. Выбіраюцца дзве дзяўчынкі, якія будуць плесці вяночак. Усе ў атрадзе пачарзе падбягаюць да тых, хто пляце вяночак і падаюць розную зяляніну, вяртаюцца назад і перадаюць эстафету наступнаму. Пасля таго, як вяночак будзе гатовы, дзяўчаты кідаюць яго на хлапцоў.*

**<u>Станцыя-палянка – “Адгадайка”</u>**

*Дзяцей сустракае вядучая ў вобразе “Кікімары”.*

**Кікімара:** Да мяне ў мой лясочак завіталі, а нічога пра сябе не сказалі. Ці з далеку вы ці не, ці ведаеце пра мяне? *(дзеці адказваюць).* Ну тады мяне слухайце. Прапушчу вас далей, калі ўсе мае загадкі адгадаеце, паспрабуем вастрыню свайго розуму. Ці ведаеце вы беларускія загадкі? Ну тады адгадвайте.

1. Каляровае карамысла цераз рэчку павісла. (Вяселка).
2. У кутку барада на кійку. (Венік).
3. Паміж гуркамі, буракамі – каза з зяленымі рагамі. (Цыбуля).
4. Красны, ды не дзеўка, з хвастом, ды не мыш? (Бурак).
5. Ішла Рася расцяглася, як устане – да неба дастане? (Дарога)
6. Вечна – беланогая,
   Ды сукенку ўсё мяняе:
   То яна зяленая. То празрыста –залатая.
   А зімовым ясным днем
   Адлівае серябром. (Бяроза).
7. Мы ўсе яму рады,
   Ды як жа інакш?
   А хто паглядзіць на яго –
   Той і заплача. (Сонца).
8. У гаі-гаёчку
   Між травы, расы –
   Белыя званочкі.
   Цвітуць дзеля красы. (Ландыш)
9. На сцяблінку сонца села,
   Белы капялюш надзела. (Рамонак)
10. Сінявокі, слаўны, чысты,

Галавасты, залацісты.
Дасць абноў ён людзям шмат.
Будзе кожны вельмі рад.(Лён)

11. Славен край наш ёй здаўна,
Трыста розных страў – яна.
І зімой і летнім часам
На яе мы вельмі ласыя. (Бульба).

12. Хвалюе водарам, красою,
Але няпроста ўзяць рукою,
Галава – пахучая,
Тулава – калючае. (Ружа).



Ну, што адгадалі, давайце вашу паштоўку адзнаку пастаўлю і далей адпраўлю.

**Станцыя-палянка – “Апанас паймай нас”**

*На станцыі сустракае дзяцей “Вяснянка”.*

**Вяснянка:** Да мяне Вяснянкі завіталі, рада я ўсім. Вось зараз з вамі мы згуляем у гульні ў якія нашы бабулькі і дзядулькі гулялі, ды нам перадалі.
А пачнем мы з гульні “Апанас паймай нас” . Зараз выбярэм Апанаса, надзенем яму на галаву капялюш і пасадзім ў сярэдзіну кола, якое зараз мы з вамі ўтворым. Будзем хадзіць вакол Апанаса, выконваючы па маёй камандзе адпаведныя рухі. Як толькі я скажу словы “Апанас, паймай нас”, Апанас пачынае лавіць вас, каго злавіў, той становіцца Апанасам і гульня працягваецца далей. Ой, добра, добра мы згулялі, а зараз прапаную іншую гульню. З ручнікамі будзем гуляць!

Выходзьце ўсе сюды шпарчэй,
У пары станьце ўсе хутчэй.
У ручнік разам закруціцеся,
Ну а потым раскруціцеся!
А падарункі тыя атрымаюць,
Што ў гульні перамагаюць.
Як музыка зайграе, дык адразу пачынаем.



*Праводзіцца гульня "Ручнік"*

**Вяснянка:** Добра, добра вы гулялі, гульні нашы пазнавалі, паштоўку вашу мне давайце, ды адзнаку атрымайце.

**Станцыя-палянка – "Паспяваем разам"**

*Сустракае дзяцей Музыка.*

**Музыка:** Як добра, што да мяне, Музыкі, завіталі. Вось зараз з вамі папрацуем, песні адгадаем, ды разам заспяваем. Так як на свята Троіца зелень і кветкі адыгрывалі галоўную ролю - ўчынім песенны марафон. Зараз раздзялю вас усіх на дзве каманды. Кожная каманда павінна ўспомніць і выканаць песню, у якой спяваецца пра якую – небудзь расліну, ці то кветачку, ці то дрэўца, тая каманда пераможа, якая больш песен успомніць.

*Праводзіцца конкурс па час якога ўдзельнікі дзеліцца на дзве каманды і пачарзе спяваюць слупок песні ў якой упамінаецца пра кветкі, расліны. Пасля чаго, вядучы – Музыка ставіць балы ў маршрутны ліст.*

*Прыкладныя песні: Ох і сеяла Ульяніца лянок", "Мы пасадзім грушку", "Касіў Ясь канюшыну", "А ў полі вярба", "Купалінка" і інш.*

**Станцыя-палянка "Русалка"**

*Сустракае дзяцей вядучая ў вобразе Русалкі.*

**Русалка:** Як жа на траецкія дні мінаваць русалак. Яны вас і ў лесе, і ў лузе, і ў полі сустрэнуць. Хто ад нас не уцячэ, таму не пашанцуе. А ведаеце, яшчэ і тое, што пасля Троіцы адзначаўся ў некаторых мясцінах нашага краю і Русальны тыдзень. У гэты час Русалкі з вады выходзілі і пасяляліся, ці то ў лесе, ці ў полі, а часам выганялі іх у жыта. Вось нам і раздоллле было, асабліва ў жыце. Калі пападзе туды хлапец маглі Русалкі, ці Каўкі і Маўкі заказытаць да смерці, вось так. А я прапаную вам у маю гульню згуляці, ды спрыт і снароўку паказаці.

*Праводзіцца гульня **"Я русалкі не баюся"**. На пляцоўцы адзначаецца поле з дапамогай вяровак, у сярэдзіне яго стаіць Русалка, (выбіраецца з дзяцей). На пярэдняй граніцы стаяць у лінію гуляючыя. Яны гавораць такія словы: "Я Русалкі не баюся, чапялой абаранюся", як толькі яны скажуць гэтыя словы пачынаюць абавязкова перабягаць цераз "поле" на другі бок граніцы, а ў гэты час Русалка пачынае лавіць ўдзельнікаў гульні, да таго часу, пакуль гуляючыя знаходзяцца на полі, а за граніцай поля, не мае права*

*лавіць. Злоўленыя выбываюць з гульні (адзін варыянт), другі варыянт – першы злоўлены становіцца Русалкай.*

**Русалка:** Добра, добра вы гулялі і Русалак шмат злавілі, але трэба вам ісці далей.

*Пасля таго, як атрады пройдуць станцыі-палянкі ўсе збіраюцца на галоўнай пляцоўцы, на якой каманды паказваюць хатняе заданее. Па ўмовах гуляння павінны былі каманды падрыхтаць карагодныя гульні, якія больш за ўсё адносяцца да свята Троіца.*



*Пасля правядзення агульных гульняў-карагодаў падводзяцца вынікі ўсяго гуляння і ўсёй нядзелі. Абвяшчаюцца балы, уручаюцца граматы, прызы, падарункі пераможцам і лепшым удзельнікам.*

**ВЯДУЧАЯ Цетка**: На развітанне прыгадаем
Усё, што вам мы пажадаем:
Будзьце ўсе моцнымі, як вада.
Багатымі, як зямля.
Працавітымі, як пчала.
Майце многа хлеба.
Будзьце прыгожымі і вясной і летам!

### Чакаемыя вынікі

Такім чынам мы бачым, што выкарыстанне гульняў, песен, пазнавальна-інтэлектуальтных праграм, правядзення свят каляндарна-абрадавага цыкла ствараюць асобы выхаваўчы цыкл. У працэсе падрыхтоўкі да свята ідзе прадуманае спалучэнне інтарэсаў, усебаковае развіццё асобы.

Вынікі правядзення нядзелі “Траецкае гулянне”:

- рэалізацыя творчага патэнцыяла кожнага дзіцяці;

- набыцце навыкаў духоўнай культуры на аснове вывучэння гісторычнай спадчыны беларускага народа;
- самарэалізацыя, самаўдасканаленне, самаразвіцце і самаазначэнне кожнага дзіцяці;
- набыцце ўдзельнікамі змены навыкаў зносінаў і талерантнасці;
- паглыбленае вывучэнне нацыянальных культурных традыцый, абрадаў, звычаяў беларускага народа;
- станаўленне грамадзянскай пазіцыі асобы;
- асабісты рост удзельнікаў змены.